# Міністр наведаў дзіцячы лагер «Крынічка»

5 чэрвеня Міністр сувязі і інфарматызацыі Сергей Пятровіч Папкоў наведаў дзіцячы лагер **«Крынічка»** філіяла «Мінская гарадская тэлефонная сетка» РУП «Белтэлекам». Лагер размешчаны ў 45 км ад МКАД па Гродзенскай шашы ў вёсцы Барок Валожынскага раёна. Міністр сустрэўся з калектывам лагера, пазнаёміўся з умовамі пражывання і, вядома, пагутарыў з дзецьмі.

Зусім нядаўна ў лагеры пачалася першая змена. Дзеці, якія прыехалі на адпачынак з усіх куткоў рэспублікі, ужо паспелі пазнаёміцца і пасябраваць. Яны з задавальненнем праводзяць час на стадыёне, валейбольнай і баскетбольнай пляцоўках, гуляюць у тэніс, ходзяць у трэнажорную залу, удзельнічаюць у творчых конкурсах і розных спаборніцтвах. Педагогі і выхавальнікі прыкладаюць усе намаганні для таго, каб дзеці добра адпачылі, набраліся сіл пасля напружанага навучальнага года і зарадзіліся выдатным настроем.

*ДАВЕДАЧНА*

*Дзіцячы лагер «Крынічка» уяўляе сабой комплекс з чатырох сучасных карпусоў са зручнымі і камфортнымі пакоямі, клубам-сталовай, медыцынскім корпусам, эстраднай пляцоўкі, спартыўнымі збудаваннямі і інш.*

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/05-06-2018-3183*